Захарэвіч С., студ. гр. 105
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Міцкевіч А.Г.,
ст. выкладчык

# АРНАМЕНТАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ ВЯЛІКАДНЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сваіх руках я трымаю ўнікальны твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і разам з тым – рэдкі музейны прадмет. Гэта драўляная форма для сыра на Вялікдзень з экспазіцыі музея Якуба Коласа (філіял Акінчыцы). Яна зроблена прыблізна напрыканцы 19, магчыма пачатку 20 ст. Называецца выраб – пасачніца.

Тварожная пасха (сырная пасха) была распаўсюджана ў многіх месцах (асабліва ў гарадах), але не паўсюль рабілі тварожную "сырную" пасху. Тварог, завернуты ў чыстую анучку, спачатку выкладалі на дошку, якая стаяла пад нахілам пад груз, каб сцякла сываратка. Потым у яго дабаўлялі масла, яйкі, смятану, цукар, разынкі і выкладвалі перамешаную массу ў пасачніцу - драўляную або жалезную форму ў выглядзе піраміды, якая разбіралася.

На сценках гэтай велікодніцы выразаны раслінныя ўзоры і літары "Х" і "В" што азначае: "Хрыстос Васкрэс". Акрамя гэтага на пасачніцы выразаны крыж - адзін з самых старажытных сімвалаў чалавецтва, які выкарыстоўваўся у многіх рэлігіях, але найбольш яго звязваюць з хрысціянствам. Крыж з'яўляецца прадметам рэлігійнага ўшанавання ў большасці хрысціянскіх канфесій. Узнікненне ў хрысціянстве культа крыжа звязана з пакутніцкай смерцю Ісуса Хрыста, якую ён прыняў на крыжы па прыгавору Понція Пілата. У хрысціянскага крыжа ёсць нямала варыянтаў. Лацінскае слова "crux" азначала "дрэва або драўляныя прылады забойства". Адпаведны дзеяслоў "cruciare", што значыць "пытаць, мучыць". "Ісус Назаранін, цар Іудзейскі" (ИНЦИ, або INRI на латыні). Ніка - пераможца. Ніжняя касая перакладзіна - падпорка для ног Ісуса Хрыста сімвалізуе "вагі", якія ўзважваюць грахі і добрыя ўчынкі ўсіх людзей.

Лічылася, што яна нахілена на левы бок, што сімвалізуе тое, што разбойнік, які пакаяўся, распяты па правы бок ад Хрыста першым трапіў у рай, а разбойнік з левага боку у ад.

На пасачніцы, пра якую я вяду размову, змешчаны розныя крыжы: лацінскі, праваслаўны, раўнастаронні крыж, так званы "Cross pattee". Я думаю, што гэта магло быць абумоўлена тым, што доўгі час на нашай зямлі змяняліся і змагаліся розныя канфесіі. Вось і атрымалася, што просты чалавек проста заблытаўся і мудра ўспрымаў крыж ва ўсіх яго мадыфікацыях як сімвал хрысціянства.

На радзіме Я.Коласа напрыканцы 19-пачатку XX стагоддзяў па-суседску жылі і часта былі блізкімі родзічамі і каталікі, і праваслаўныя, і габрэі. Можа быць таксама, што ў той год, калі выразалася форма, было зліццё ўсіх пасак і майстар выразаў усе крыжы, каб нікога не пакрыўдзіць. Яшчэ на ёй ёсць выявы прылад працы, "кап'ё і посах" - сімвалы пакут і ўваскрасення Хрыстова, "райская лесвіца", птушка (тут фактычна ў вобліку пеўня) - вобраз Святога Духа. У цэлым выявы на пасачніцы маюць светлую жыццесцвярджальную сімволіку, якую можна зараз лепш назіраць на гіпсавым муляжы, які пасля рэстаўрацыі пасачніцы быў адліты з гэтай формы для экспазіцыі музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ